*Л. І. Ракавецкая* (*Мінск*),
*вучоны сакратар БелДІПК, кандыдат педагагічных навук*

# БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАЯ АДУКАЦЫЯ: ВОПЫТ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

Бібліятэчна-інфармацыйная адукацыя перажывае час значных змен, што абумоўлена не толькі рэарганізацыяй вышэйшай школы, але і прафесійнымі прычынамі. Змяненні менталітэта, арганізацыі і форм работы бібліятэк, пашырэнне сферы інфармацыйна-бібліятэчнай дзейнасці, укараненне новых камп'ютэрных тэхналогій у практыку работы патрабуюць актуалізацыі бібліятэчна-інфармацыйнай адукацыі.

Неабходнасць павышэння прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэчных кадраў узнікла пад уздзеяннем росту інфармацыйных рэсурсаў, ускладнення адбору новай інфармацыі. Сталі назірацца парадаксальныя выпадкі, звязаныя з пошукам інфармацыі, калі падчас лягчэй штосьці зноў адкрыць, чым знайсці апісанне ранейшых вынаходстваў.

У такой сітуацыі ўзрасла патрэбнасць у навучанні камп'ютэрнай культуры, арганізацыі сістэмы стварэння і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў і паслуг. Гэта прывяло да істотных змяненняў у вучэбных планах Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры, што знайшло сваё падмацаванне ў дзяржаўным адукацыйным стандарце, дзе адлюстравана імкненне да гарманізацыі вышэйшай бібліятэчна-інфармацыйнай адукацыі і арыентацыі на шырокую перспектыву развіцця бібліятэчнай практыкі.

Тэхнічная мадэрнізацыя бібліятэчнай справы ў Беларусі дыктуе неабходнасць рэарганізацыі таксама і сістэмы дадатковай прафесійнай адукацыі бібліятэчных кадраў.

Новы падыход да перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі бібліятэкараў прадугледжвае накіраванасць усяго адукацыйнага працэсу на адаптацыю іх да выканання інфармацыйных прафесійных задач з улікам канкрэтных напрамкаў тэхнічнай рэканструкцыі бібліятэчнай справы.

Сістэмнасць пабудовы вучэбных праграм, варыятыўнасць у залежнасці ад кантынгенту слухачоў і ўзроўню іх прафесійнай падрыхтоўкі, накіраванасць на асваенне інавацыйных ведаў доўгатэрміновага выкарыстання — асноўныя прынцыпы рэалізацыі новага падыходу да фарміравання сістэмы дадатковай прафесійнай адукацыі ў галіне.

Менавіта гэтыя прынцыпы і пакладзены ў аснову пабудовы чатырох вучэбных праграм ("Арганізацыйныя і метадычныя асновы інфарматызацыі бібліятэк", "Асновы інфармацыйных тэхналогій", "Архітэктура і функцыяльныя падсістэмы АБІС", "Эксплуатацыя АБІС"), распрацаваных у Беларускім дзяржаўным інстытуце праблем культуры дадаткова да "Мадэлі перападрыхтоўкі спецыялістаў публічных бібліятэк па авалоданню камп'ютэрнай тэхнікай і новымі тэхналогіямі" (1999 г.), дзе адлюстраваны ўзроўні перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў у галіне аўтаматызацыі. Гэта дазваляе слухачам фарміраваць новае бібліятэчнае мысленне, арыентавацца на сеткавыя рэжымы работы і выкарыстанне інфармацыйных рэсурсаў, атрымліваць веды, якія можна выкарыстаць у мэтах рэарганізацыі традыцыйных участкаў бібліятэчнай работы.

Трэба адзначыць, што неабходнасць стварэння курсаў па перападрыхтоўцы спецыялістаў бібліятэк (і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не толькі ў галіне аўтаматызацыі) даўно наспела. Гэта дазволіла б зняць вострую патрэбу ў бібліятэчных кадрах не толькі ў сістэме Міністэрства культуры, але і забяспечыць перападрыхтоўку спецыялістаў для работы ў школьных бібліятэках Міністэрства адукацыі, а таксама для іншых міністэрстваў і ведамстваў краіны.

У той жа час для ўдасканалення сістэмы перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў неабходна разгледзець і вырашыць шэраг складаных праблем:

— выявіць колькасць бібліятэк і бібліятэкараў, зацікаўленных у перападрыхтоўцы;

— вывучыць матывы перападрыхтоўкі, якімі кіруюцца слухачы курсаў;

— вызначыць адукацыйныя блокі дысцыплін, асваенне якіх дазволіць авалодаць неабходнай кваліфікацыяй у кароткі тэрмін;

— падабраць высокакваліфікаваных выкладчыкаў з ліку спецыялістаў, здольных перадаць свае веды і ўменне людзям, якія маюць вышэйшую адукацыю па той або іншай спецыяльнасці;

— удасканаліць сістэму стажыровак;

— прадугледзець праграмна-інфармацыйнае і навукова-метадычнае забеспячэнне перападрыхтоўкі;

— распрацаваць сучасную мадэль перападрыхтоўкі бібліятэчных кадраў у адпаведнасці з Міжнародным стандартным ІФЛА па бібліятэчнай адукацыі;

— здзейсніць пошук і пашырыць формы арганізацыі працы на камерцыйнай аснове.

Першыя крокі ў вырашэнні пастаўленых задач зроблены, неабходна скаардынаваная даследчая работа па данай праблеме.

*С. И. Шереметьев (Минск),*
*аспирант Белорусского государственного университета культуры*

# КУЛЬТУРА ОБЩЕНИЯ КАК ФАКТОР ПОВЫШЕНИЯ ПРОФЕССИОНАЛЬНОГО МАСТЕРСТВА БУДУЩИХ СОЦИАЛЬНЫХ РАБОТНИКОВ

Социальная работа, осуществляемая на современном витке развития общества, стала новым этапом в осмыслении принципов поддержки и защиты каждого нуждающегося человека. На эту работу возложена миссия по устранению ряда "недостатков" общества, коррекцию и реабилитацию человека. Она вырабатывает нормативные требования и ценностные ориентиры общества, способствует нормализации общественных связей и отношений, выступает как процесс по сохранению и восстановлению человеческих ресурсов в целях стабилизации экономических, социальных, общественных отношений и связей.

Столь большие надежды, возлагаемые на социального работника, предполагают дополнительную моральную ответственность его перед обществом, статусом добровольно выбранной профессии и коллегами по работе. Поэтому так важно, чтобы будущий социальный работник понимал всю значимость выбранной им профессии, знал о ее нравственно-ценностном содержании, приобретал

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ